

ЛЯДОВЫЯ АРЭНЫ І БАСЕЙНЫ ЯК ЧАСТКА ШКОЛЬНАГА НАВУЧАННЯ **3**




БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС — БІБЛІЁГРАФ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ **7**


18 КРАСАВІКА 2023 г.
АЎТОРАК
№ 73 (29953)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА




Фота БелТА.

З першых вуснаў

## «Светлае добрае свята, калі хочацца проста жыць спакойна»

**По традыцыі ў самае галоўнае хрысціянскае свята кіраўнік дзяржавы разам з вернікамі ў храме запальвае свечку. Сёлета Прэзідэнт наведаў Спаса-Праабражэнскую царкву ў Шклове. Будаўніцтва храма пачалося ў канцы XVIII стагоддзя фаварытам Кацярыны II Сямёнам Зорычам, а скончана было ў другой палове XIX стагоддзя на сродкі верніцы са Шклова Агафіі Сідаравай, якая лічыцца заснавальніцай гэтай святыні. Царква дзейнічала нават у гады атэізму і Вялікай Айчыннай вайны. Сёння храмавы комплекс уключае Спаса-Праабражэнскі храм, нядзельную школу і прытчавы дом.**

«Для мяне сённяшні дзень — асаблівы. Я заўсёды з вялікім хваляваннем, прылятаючы з працяглых камандзіровак або прыязджаючы сюды, гляджу на гэтую добрую зямлю. Вы для мяне людзі асаблівыя, вы гэта ведаеце. Менавіта з вас, з вашых бацькоў усё некалі пачалося ў нас з вамі, у маім жыцці. Калісьці вы юнаму чалавеку паверылі і адправілі мяне з гэтай зямлі ў доўгую дарогу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён асобна звярнуўся да моладзі, прызнаўшыся, што тады не разумеў, як з часам цягне дадому. «Рана ці позна мы ўсе вернемся дадому. Таму я з асаблівым хваляваннем бываю тут. Вы, мабыць, заўважылі, што ў Шклове я спыняюся рэдка. Можа быць, і адбіваецца гэтае хваляванне. Але прыходзіць час, калі цябе асабліва цягне дадому, на радзіму. Кажуць, калі табе нешта часта сніцца, трэба туды прыехаць. Таму я прыехаў сёння да вас, да сваіх блізкіх добрых людзей, каб найперш падзякаваць за тое, што вы зрабілі ў маім жыцці. Не скажу, што яно было для мяне вельмі салодкім. Але так ужо здарылася. Падзякаваць за тую веру, якую вы падарылі мне шмат гадоў таму», — адзначыў Прэзідэнт.

Па яго словах, Вялікдзень — вялікае, добрае свята, з якім у плане чакання можа параўнацца хіба Новы год. Па словах кіраўніка дзяржавы, усе святы — духоўныя і свецкія — вельмі каштоўныя для беларускага народа: «Хто скажа, што Дзень Перамогі для нас не каштоўнае свята? І Раство Хрыстова для нас добрае светлае свята. Але ніякія іншыя святы, як Новы год і Вялікдзень, у нашых сем'ях не чакаюць. Таму сёння адно з гэтых двух вельмі шанаваных і чаканых свят», — падкрэсліў беларускі лідар. — «Светлае добрае свята, калі хочацца проста жыць спакойна. Нічога не казаць і слухаць цішыню. У мяне так, мабыць, так і ў многіх. Хоць пасля працяглага посту людзі рыхтуюцца да яго... Гэта дзень асаблівы, дзень шанаваны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«З гэтага старажытнага храма я хачу павіншаваць нашых беларусаў, усіх, хто нас сёння ўбачыць. Яшчэ раз хачу, падзякаваўшы, павіншаваць вас з гэтым добрым, светлым святам. Самае галоўнае — міру і здароўя. Усё астатняе мы знойдзем, а калі не знойдзем — купім», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў сітуацыі, якая разгортваецца вакол, патрабуюцца каласальныя намаганні, каб захаваць гэты мірны астравок. «Калі кожны будзе займацца сваёй справай, мы захаваем. Мы зробім неверагоднае ў гэтай сітуацыі, мы захаваем мір на гэтай зямлі, калі вакол усё бурліць і шуміць. Многія, не ведаючы, не разумеючы, не плануюць нейкія далёкія перспектывы, не ведаюць, што будзе заўтра. Заўтра будзе ўсё нармальна. Будзьце ў гэтым упэўненыя. Жывіце мірна, спакойна», — запэўніў ён. — Здароўя вам, асабліва вашым дзецям. Вы ведаеце, калі з дзіцем нешта не так, жыць не хочацца. Таму, каб хацелася жыць, трэба, каб была моцная сям'я і галоўнае — здаровыя дзеці. Шчасця, міру, дабра», — пажадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка перадаў Спаса-Праабражэнскаму храму ікону «Гасподзь Уседзяржыцель», падкрэсліўшы, што гэта каштоўны для яго абраз. «Няхай будзе ў вас. Калі трэба будзе яшчэ — вы скажыце. Мне за апошнія дзесяць гадоў падарылі столькі ікон. Яны ў Палацы Незалежнасці, таму мы адтуль можам перадаць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аўтар работы — іерэй Сергій Нежбарт, кіраўнік іканапіснай майстэрні Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра. Ікона «Гасподзь Уседзяржыцель» — адзін з самых старажытных і шанаваных у народзе тыпаў выявы Збавіцеля. На ёй Ён паўстае ў вобразе Сусветнага Уладара і Суддзі, Які аддае кожнаму па веры і дзеях. Гэтае ўвасабленне Найвышэйшага закона і справядлівасці — суровае і непадкупнае, але літасцівае і ўсёдаравальнае.

СТАР. 2

# ГЭТА ПАТРЭБНА ЖЫВЫМ




Фота БелТА.

**Каб зрабіць добрую справу, асаблівай нагоды чакаць не трэба. Учора члены Віцебскага абласнога каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый прынялі ўдзел у добраўпарадкаванні воінскага пахавання № 4407 у вёсцы Заронава Віцебскага раёна. На воінскім мемарыяле ўшанавана 10,5 тысячы прозвішчаў байцоў Чырвонай Арміі.**

Эх, дарогі

## ВЫТОКІ ДАРОЖНЫХ АРТЭРЫЙ

**У Віцебскай вобласці пачалася буйная рэканструкцыя аўтадарогі Полацк—Лепель. Менавіта па трасе рэспубліканскага значэння Р46 ляжыць шлях з Полацка, Наваполацка, Верхнядзвінска, а таксама Прыбалтыкі і Расіі ў беларускую сталіцу.**

Рэалізацыю праекта ажыццяўляе РУП «Віцебскаўтадар», работы стартавалі з другой чаргі (31,9 — 61,5 км) на ўчастку ад населенага пункта Сарочына да Полацка. Кошт будаўніцтва другой чаргі па каштарысе ў цэнах на жнівень 2022 года складаў 157,9 мільёна рублёў, на дату заканчэння будаўніцтва — больш за 179,8 мільёна рублёў. Нарматыўны тэрмін выкання рамонту на дадзеным участку — 24 месяцы, усяго дарожнікі плануюць рэканструяваць каля 60 кіламетраў.

СТАР. 3




Сучасныя тэхналогіі

## Штучны інтэлект, разумныя гарады, віртуальныя падарожжы...




### Лічбавыя цікавінкі форуму ТІБА-2023

**XXIX міжнародны форум па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях ТІБА-2023 адкрываецца сёння ў Мінску. Гэта найбуйнейшае ў Беларусі мерапрыемства ў сферы інфармацыйных тэхналогій, у якім сёлета ўдзельнічае звыш 260 айчынных і замежных вытворцаў тэлекамунікацыйнага абсталявання і апаратных сродкаў, вытворцаў і пастаўшчыкоў высокатэхналагічных прадуктаў і інтэлектуальных рашэнняў, кампаніі-аператары мабільнай сувязі і іншыя арганізацыі, для якіх лічбавізацыя не проста работа, а шлях у будучыню. Чым будзе здзіўляць ТІБА-2023, якія навінкі можна пабачыць, якія — апрабаваць на сабе проста на выставе, якія — варта спампаваць на тэлефон, паглядзела карэспандэнт «Звязды».**

СТАР. 8

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Бразіліі прапанаваў стварыць аналаг G20



Луіс Інасіу Лула да Сілва ў зносінах са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам і прэзідэнтам ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам Аль Нахаянам прапанаваў ім ролю медыятараў ва ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне. Аб гэтым паведаміла ТАСС, спасылаючыся на заяву прэзідэнта Бразіліі. Паведамляецца, што Луіс Інасіу Лула да Сілва выступіў з прапановай стварыць аналаг групы G20, краіны-ўдзельніцы якой будуць выконваць ролю пасрэднікаў паміж афіцыйнымі Масквой і Кіевам. Ён аргументаваў сваю ініцыятыву тым, што ў свой час «Група дваццаці» стваралася для вырашэння эканамічнага крызісу ў свеце. Лула да Сілва абазначыў, што на дадзеным этапе важнае ўсталяванне міру. Раней прэзідэнт Бразіліі заяўляў, што Расійская Федэрацыя — гарант доўгатэрміновага міру ва ўсім свеце.

### На антыўрадавы мітынг у Празе сабралася каля 35 тысяч чалавек

ISSN 1990 - 763X

Пратэстоўцы сабраліся з розных куткоў Чэхіі. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны», спасылаючыся на газету Idnes. Дэманстрацыя праходзіла пад лозунгам «Чэхія супраць беднасці». Арганізатарам масавага мерапрыемства выступіла партыя «Права. Павага. Прафесіяналізм». Па іх заяве, мэтай мітынгу з'яўлялася спроба звярнуць увагу ўлад на імклівае збядненне простых жыхароў Чэхіі. Арганізатары аргументавалі гэта тым, што на грамадзян дзяржавы абрынуліся праблемы, сярод якіх каласальнае падаражанне энерганосьбітаў, прадуктаў харчавання, паліва, а таксама паслуг. Як заяўлена, падчас мітынгу ўсе жадаючыя падпісалі зварот да ўрада, у якім палітыкаў заклікалі распрацаваць рашучыя і эфектыўныя меры для паляпшэння становішча насельніцтва.



### У выніку стральбы на дзіцячым свяце ў ЗША загінулі чатыры чалавекі

У выніку стральбы на дне нараджэння падлетка ў ЗША загінулі чатыры чалавекі, 20 чалавек атрымалі раненні. Аб гэтым паведаміла газета The New York Post. Стральба адбылася ў танцавальнай студыі ў Дэйдвілі, штат Алабама. Большасць ахвяр — падлеткі, якія прысутнічалі на вечарынцы з нагоды дня нараджэння. На думку мясцовай паліцыі, да стральбы прывяла сварка паміж удзельнікамі свята.



## КОРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям XXIX Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях «ТІБА-2023».
- **ВУП Беларусі ў першым квартале 2023 года склаў Br46,5 млрд.**
- БРСМ запрашае 29 красавіка да ўдзелу ў мерапрыемстве «Моладзь — працы і абароне».
- **Конкурс інвестпраектаў малога бізнесу для аказання дзяржпадтрымкі праводзіцца ў Беларусі.**
- У МПЗ нагадалі ІП аб выплаце падаходнага падатку з фізічных асоб да 26 красавіка.
- **Тэма імпартазамяшчэння стане дамінантай міжнароднага эканамічнага форуму ў Віцебску.**
- Мінаблвыканкам і БПЦ правядуць акцыю «Падары радасць бліжняму» ў 19 дамах-інтэрнатах.
- **Адкрыты чэмпіянат Беларусі па спартыўных танцах на калясках адбудзецца ў час II Гульняў краін СНД.**
- Цэны на каштоўныя металы, якія скупляюцца ў фізічных асоб, павялічацца з 24 красавіка.
- **Пілотная версія сацыяльнага праекта па развіцці інклюзіі ў школе рэалізуецца ў Мінскім раёне.**
- Яўген Ватуцін і Вікторыя Нікалаева сталі чэмпіёнамі Беларусі па стаклетачных шашках.
- **Санэпідслужба за тыдзень забараніла продаж 660 кг небяспечнай кулінарнай і кандытарскай прадукцыі.**

Атрады на старце

## ПРАЦОЎНЫ МАЛАДЗЁЖНЫ РУХ НАБІРАЕ АБАРОТЫ

### Першым у Гродзенскай вобласці выйшаў на работу экалагічны дэсант



**У складзе першых атрадаў каля 200 старшакласнікаў з розных раёнаў вобласці, перад якімі стаіць задача па аднаўленні лясоў і азеляненні гарадскіх тэрыторый. Пачаўся гэты рух у канцы сакавіка з прыборкі і падрыхтоўкі тэрыторый. Цяпер вядзецца работа па высадцы раслін. Толькі ўявіце — за дзень удзельнік атрада высаджвае да 800 хвойных саджанцаў, а 140 чалавек — да васьмі гектараў.**

#### ЛЯСЫ АДНОВЯЦЬ У ТЭРМІН

Экалагічныя атрады створаны ў Смаргонскім, Свіслацкім, Шчучынскім і Гродзенскім раёнах. Напрыклад, у Свіслачы на пасадцы лесу працуюць 20 школьнікаў СШ № 2, якія аб'яднаны ў атрад «Іскра». Працоўны праект разлічаны на два тыдні і завершаецца сёння. Як расказала **першы сакратар раённага камітэта БРСМ Кацярына ДАНІЛОВІЧ**, старшакласнікі едуць на работу пасля школьных заняткаў і вельмі адказна ставяцца да сваіх абавязкаў. Тут ёсць і добры матэрыяльны стымул: за 12 дзён можна зарабіць да 200 рублёў.

СТАР. 3

# «Светлае добрае свята, калі хочацца проста жыць спакойна»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На іконе відаць праблiскi Божага святла, якія ліюцца ад Госпада, тым самым аўтар паказвае не проста фізічны стан, але і духоўную сутнасць, а значыць, раскрывае Божы пачатак Ісуса Хрыста. Ікона «Ісус Уседзяржыцель» дапамагае пазбавіцца ад розных цяжкасцяў, здабыць моцную веру і суцяшэнне. Гэтая ікона з'яўляецца неад'емным элементам унутранага афармлення цэркваў.

## ДЗЯРЖАВА ТРЫВАЛА СТАІЦЬ НА НАГАХ, КАЛІ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ГАРМОНІІ З БОГАМ

Настаяцель Спаса-Праабражэнскага храма Андрэй Рыбакоў расказаў, што сёлета храм адзначае 160-годдзе. Ён падзякаваў Прэзідэнту за тое, што ён у сваім шчыльным графіку знайшоў час наведаць храм. «І мы хацелі б вам падзякаваць за магчымасць пад мірным небам адзначаць светлае свята Вялікадня. У гэтым храме заўсёды падчас літургіі гучыць малітва аб беларускім народзе. Шматвекавая гісторыя паказвае, што дзяржава трывала стаіць на нагах, калі яна знаходзіцца ў гармоніі з Богам і царквой, клапоцячыся аб духоўным і матэрыяльным дабрабыце свайго народа. Гасподзь заўсёды такі народ блаславіляе мірам», — адзначыў Андрэй Рыбакоў.

Настаяцель храма перадаў у дар кіраўніку дзяржавы ікону «Уваскрэсенне Хрыстова» з дванадзясятымі святамі, выкананую ў тэхніцы мініяцюрнага жывапісу метадам нанясення эмалі. Па перыметры размешчаны невялікія вобразы, якія апісваюць асноўныя дванадзясятыя святы — дванаццаць найважнейшых (пасля Вялікадня) гадавых царкоўных свят, звязаных з Евангельскай гісторыяй і гісторыяй Царквы і прысвечаных падзеям зямнога жыцця Збавіцеля і Багародзіцы. На іконе «Уваскрэсенне Хрыстова» адлюстроўваецца падзея, да якой прымеркавана свята святога Вялікадня, калі распяты Збавіцель паўстаў з мёртвых на трэці дзень пасля жорсткага пакарання. Уваскрэслы Хрыстос намаляваны ў цэнтры палатна ў зіхатлівым адзенні. Ззаду Збавіцеля — сіне-блакітная сфера як сімвал Божай ласкі. Пад нагамі Хрыста намаляваны абломкі разбураных сцен пекла як сімвал таго, што для ўсемагутнага Госпада не існуе перашкод. Знізу, па баках ад Хрыста, намаляваныя першыя грэшнікі, Адам і Ева, якія звяртаюць умольныя позіркі да Збавіцеля з маўклівай просьбай аб прабачэнні. Гасподзь адпускае ім грахі і бярэ тых, хто пакаяўся, за рукі. Па абодва бакі ад фігуры Хрыста намаляваны святыя ўгоднікі і цары.

**Валерыя СЦЯЦКО,**

*г. Шклоў.*

Блізкая ўлада

# СЭРЦА МІНСКА І КРАІНЫ

## Чым жыве Маскоўскі раён сталіцы



**Маскоўскі раён — адзін з самых густанаселеных у Мінску. Умоўна яго можна падзяліць на дзве часткі — тую, што знаходзіцца ў цэнтры горада, дзе ёсць мноства гісторыка-культурных аб'ектаў, і так званы спальны раён — кварталы шматпавярховай жылой забудовы. А яшчэ тут ёсць праспект, названы ў гонар нашай газеты. Аб тым, як сёння жыве Маскоўскі раён Мінска, карэспандэнту «Звязды» расказала кіраўнік яго адміністрацыі Таццяна КАЛЯДКА.**

***— Маскоўскі раён сталіцы апошнія гады перажывае актыўны рост. Жылы фонд імкліва павялічваецца. Як у такой сітуацыі адміністрацыя вырашае пытанні развіцця сацыяльнай, транспартнай, жыллёва-камунальнай інфраструктуры, бытавыя і іншыя праблемы грамадзян?***

— Сапраўды, Маскоўскі раён — адзін з найбуйнейшых раёнаў горада Мінска. На яго тэрыторыі пражывае звыш 310 тысяч чалавек. Пры гэтым раён працягвае расці і па плошчы, і па колькасці насельніцтва. Літаральна за мінулы год узведзена 87 тыс. кв. м жылля. А за апошнія пяць гадоў уведзена ў эксплуатацыю больш як 815,9 тыс. кв. м жылля.

Адкрыты новыя сацыяльныя аб'екты: дзве паліклінікі (адна дзіцячая і адна для дарослага насельніцтва) — сем устаноў адукацыі: пяць дзіцячых садкоў і дзве школы — пабудаваны басейн. Праведзена рэканструкцыя галоўнага корпуса з прыбудовай кардыяхірургічнага аперблока і блока трансплантацыі ствалавых клетак Мінскага гарадскога навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантологіі і гематалогіі па вуліцы Сямашкі. Пабудаваны новы тэрапеўтычны корпус 4-й гарадской клінічнай бальніцы і лабараторны корпус Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Уведзены ў эксплуатацыю два новыя спартыўныя аб'екты.

Вялікая ўвага ўдзяляецца будаўніцтву жылога комплексу «Пятроўскія верфі» ў межах вуліц Сямашкі і Пятроўшчына. Работы тут вядуцца ў рамках 1-й чаргі будаўніцтва Санкт-Пецярбургскага квартала — гэта будзе комплекс з дзевяці шматкватэрных жылых дамоў з убудаванымі аб'ектамі грамадскага прызначэння і абслугоўвання.

Зараз у раёне ідзе будаўніцтва новых карпусоў 4-й гарадской клінічнай бальніцы, таксама будуецца дыягнастычны, палатны і аперацыйна-рэанімацыйны корпус РНПЦ «Кардыялогія».

Вельмі значны адукацыйны і навуковы патэнцыял. Сістэма адукацыі, якая склалася ў раёне, дазваляе не толькі ўлічваць інтарэсы, здольнасці і асаблівасці развіцця дзяцей, але і на працягу апошніх гадоў займаць раёну лідзіруючую пазіцыю па якасці адукацыі.

Створаная за дзесяцігоддзі спартыўная інфраструктура дае магчымасць далучыць усе сацыяльныя і ўзроставыя групы насельніцтва да актыўных заняткаў фізічнай культурай і масавых відаў спорту, актыўна падтрымліваць дзіцяча-юнацкі спорт, рыхтаваць рэзерв нацыянальных і зборных каманд Рэспублікі Беларусь.

Не страчвае актуальнасці і работа па азеляненні тэрыторый. За апошнія некалькі гадоў высаджана больш за 14,7 тысячы дрэў і 63,5 тысячы кустоў, устаноўлена каля 300 малых архітэктурных форм. У раёне два паркі і 12 сквераў агульнай плошчай звыш 70 гектараў. Адно з самых любімых месцаў адпачынку гараджан — парк імя М. Я. Паўлава: на тэрыторыі плошчай 29 га — вялікі вадаём, каля 4 тысяч дрэў.

Сёння гэта галоўная пляцоўка для правядзення раённых культурна-масавых мерапрыемстваў і народных гулянняў, месца для пешых, веласіпедных прагулак, заняткаў спортам. Парк працягвае ўдасканальвацца — у выніку комплекснай рэканструкцыі ён ператворыцца ў сучасны добраўпарадкаваны цэнтр адпачынку з захаваннем прыродна-ландшафтных асаблівасцяў.

***— У чым, на ваш погляд, заключаюцца асноўныя адрозненні Маскоўскага раёна ад іншых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак сталіцы?***

— 45 гадоў таму, у 1977-м, на карце Мінска з'явілася новая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка — Маскоўскі раён. Гэта адна з самых маладых тэрыторый беларускай сталіцы, якая дынамічна развіваецца. За гэты час колькасць насельніцтва павялічылася больш чым у тры разы, перасягнуўшы 311 тысяч чалавек. Па гэтым паказчыку Маскоўскі — другі сярод дзевяці раёнаў сталіцы. Пры тым шчыльнасць насельніцтва складае 9484 чалавекі на 1 км², што ў 1,7 раза вышэй, чым у цэлым па Мінску.

Раён цалкам апраўдана можна назваць сэрцам не толькі сталіцы, але і краіны: акрамя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Мінскага гарадскога Савета, якія функцыянуюць на яго тэрыторыі, тут засяроджана нямала міністэрстваў і ведамстваў. А яшчэ на яго тэрыторыі знаходзіцца Дом урада, дзе працуюць Савет Міністраў і Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Яшчэ адзін важны аб'ект забудовы праспекта Дзяржынскага — жылы комплекс «Студэнцкая вёска». Аналагаў яму няма ва ўсёй Беларусі. Размясціўшыся на плошчы 40 га, ён аб'ядноўвае дзевяць студэнцкіх інтэрнатаў кватэрнага тыпу, у якіх пражывае больш за 10 тысяч студэнтаў.

***— Як спрацавалі буйныя прадпрыемствы раёна ў мінулым годзе? Які ўклад яны ўнеслі ў агульны бюджэт горада?***

— У Маскоўскім раёне ажыццяўляюць дзейнасць больш за 8000 юрыдычных асоб і 12 000 індывідуальных прадпрымальнікаў. Неабходна адзначыць, што ўклад Маскоўскага раёна ў бюджэт горада складае каля 14 %, раён стабільна займае трэцяе месца сярод усіх раёнаў горада па паступленні ў бюджэт.

Асноўны ўклад у эканоміку раёна ўносяць такія сферы дзейнасці, як прамысловасць, гандаль, інфармацыя і сувязь, а таксама транспарт. Калі казаць аб прамысловых прадпрыемствах, аб'ём прамысловай вытворчасці штогод складае больш за 660 млн долараў ЗША, 43 % прадукцыі інавацыйнай, больш за 55 % прыпадае на экспарт.

Флагманамі з'яўляюцца РУП «Белмедпрэпараты», РУП «Завод электронікі і бытавой тэхнікі «Гарызонт», ЗАТ «Вітэкс», СП ТАА «Беліта», ААТ «Мінскі вагонарамонтны завод», на долю якіх прыпадае больш як 70 працэнтаў прамысловай прадукцыі ў раёне.

Асаблівым гонарам раёна з'яўляецца фармацэўтычны комплекс. Лекавыя сродкі вытворчасці РУП «Белмедпрэпараты», СААТ «Ферэйн» і РУП «Унітэхпрам БДУ», а таксама апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх ТАА «Рэспект-Плюс» асабліва запатрабаваны ва ўмовах пандэміі.

Трэба адзначыць, што пасля ўвядзення заходніх санкцый беларускія фармацэўтычныя заводы не спыніліся. Для пераадолення залежнасці ад заходняй сыравіны многія з іх узмацнілі стратэгію імпартазамяшчэння і стварылі свой канкурэнтаздольны тавар.

***— Наколькі за апошні час павысіўся ўзровень жыцця людзей?***

— Паляпшэнне дабрабыту насельніцтва з'яўляецца адной з найважнейшых задач сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна. Штогод забяспечваецца значны рост даходаў людзей. Так, летась сярэдняя намінальная налічаная заработная плата ў Маскоўскім раёне перавысіла 2200 рублёў (2227,5 рубля) і павялічылася на 12,2 працэнта да ўзроўню 2021 года. У цэлым па Мінску тэмп росту заработнай платы склаў 111,5 %.

Неабходна адзначыць, што Маскоўскі раён займае першае месца ў Мінску па колькасці працоўных, яго ўдзельная вага складае 15 %. Найбольшы рост заработнай платы адбыўся ў сферы прамысловасці, транспарту, грамадскага харчавання і гасцінічнага бізнесу.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

**Фота з архіва адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска.**

Будзь у курсе!

# Дзіцячая чыгунка адкрывае сезон летніх перавозак

**Сёлета Дзіцячая чыгунка імя К. С. Заслонава адкрые свой 68-ы сезон 30 красавіка, у нядзелю.**

У гэты дзень у 9.30 пройдзе ўрачыстая лінейка для юных чыгуначнікаў. У першы рэйс цягнік з пасажырамі адправіцца ў 11.00, інфармуе прэс-цэнтр магістралі. «Сталічны экспрэс» правязе пасажыраў па маршруце ад станцыі «Заслонава» праз станцыю «Піянерская» да станцыі «Сасновы Бор» і назад.

У маі цягнікі на «малой Беларускай» будуць курсіраваць у выхадныя дні 1, 6, 7, 8, 9, 14, 20, 21, 27 і 28.

Акрамя падарожжа па Дзіцячай чыгунцы, юныя госці могуць таксама паспрабаваць сябе ў ролі машыніста. У зале чакання на станцыі «Заслонава» дзейнічае гульнявы модуль, які імітуе працоўнае месца машыніста — з сапраўднымі органамі кіравання лакаматывам і адлюстраваннем на вокнах-экранах руху па ўчастку чыгункі.

На экране інфармацыйнага кіёска можна прачытаць цікавыя факты з гісторыі дзіцячых чыгунак, разабрацца, чым адрозніваюцца розныя мадэлі рухомага саставу, даведацца, што вывучаюць юныя чыгуначнікі ў тэорыі і як потым замацоўваюць свае веды на практыцы.

Таксама цікавасцю ў малых і дарослых карыстаецца вялікі чыгуначны макет, на якім прадстаўлены работа станцыі, рух пасажырскіх і грузавых саставаў, праезд аўтамабіляў праз пераезд.

Да Дня Перамогі для мінчан і гасцей сталіцы на Дзіцячай чыгунцы імя К. С. Заслонава рыхтуецца канцэртная праграма. Яна будзе арганізавана 9 мая на станцыі «Заслонава».

Больш падрабязную інфармацыю аб графіку работы Дзіцячай чыгункі можна атрымаць па тэлефоне (+375 17) 379 65 75 і на яе старонцы на сайце www.minsk.rw.by.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот:** капитальное строение с инвентарным номером 130/С-45564 (наименование: гараж; назначение: здание специализированное транспорта), площадью 232,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Базовая, д. 8, на земельном участке с кадастровым номером 144500000015000123, площадью 0,1655 га, составные части и принадлежности: дощатый навес, дощатая уборная, забор железобетонные плиты, металлические ворота, калитка

| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | 180 000,00 | **Размер задатка, руб.** | 18 000,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Пинсксовхозстрой» юрид. адрес: 225730 Брестская обл., Пинский р-н, д. Пинковичи, ул. Железнодородная, д. 61, почт. адрес: 224144, Брестская обл., г. Пинск, пр-т Жолтовского, 61, тел./ф 80165610045. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. Обременение: наличие действующих договоров аренды части имущества сроком до 31.05.2023

**Аукцион состоится 23 мая 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 22 мая 2023 г. до 17.00**

**Открытый аукцион № 14/23 по продаже административного помещения**

Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», ул. Пономаренко 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, РБ, тел.: + 375 (17) 256-61-35. Продавец – ЗАО Банк ВТБ (Беларусь).

**Аукцион состоится 24.05.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, п. 701**

Лот № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7054974, площадью 222,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. К. Цеткин 51-2. Назначение: помещение финансового назначения.
**Начальная цена продажи лота – 926 520 бел. руб. с учетом НДС 20 %, сумма задатка – 300 бел. руб.**

Порядок проведения и выбора победителя: победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия. Шаг аукциона – 5 % от начальной стоимости

Прием заявлений: заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка: 19.05.2023 до 17.00**

Задаток: для участия в аукционе необходимо внести задаток в вышеуказанном размере. Банковские реквизиты:
- для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;
- для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета:
в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22. Получатель: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068. Назначение: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона № 14/23»

Затраты и вознаграждение: возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 14/23. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на расчетный счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона. Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.

**Контакты: + 375 (17) 256-61-35 • + 375 (25) 549-86-22**
**auction@expertiza.by, http://www.expertiza.by**

**ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,**
***опубликованную в газете «Звязда» от 11.09.2021 № 175 (29544), от 23.08.2022 № 164 (29786), от 08.11.2022 № 219 (29841)***

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг»

информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства нежилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

**Информация о застройщике**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 11.09.2021 № 175 (29544), следующие дополнения:

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (нежилых помещений), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:**

- 1 (одно) административно-торговое помещение общей площадью по проекту 133,2 кв. м. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади административно-торгового помещения составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1 200 долларов США, при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платеже составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1 300 долларов США.

На предприятии действует система регулирования цены квадратного метра, зависящая от общей площади, типа планировки нежилого помещения, а также система скидок, зависящая от размера первоначального взноса и графика внесения платежей. Цена объекта долевого строительства (цена договора), установленная в договоре в привязке к иностранной валюте, является неизменной до окончания строительства, за исключением случаев, изменения цены объекта долевого строительства по соглашению сторон.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375 (17) 392 20 45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте www.sit.by.

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества **общества с ограниченной ответственностью «Юнайтед Стил-Ситинг»** (УНП 291479120), объявляет о проведении **18.05.2023 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

СБЕР БАНК

**Уважаемые Владельцы (физические лица)**

**текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «Сбер Банк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

В отношении текущих (расчетных) счетов, открытых с 20.05.2020, а также текущих (расчетных) счетов, доступ к которым обеспечивается при использовании банковской платежной карточки, открытых с 05.05.2017 (далее – текущие счета), с 02.11.2020 Банком введен тариф за обслуживание таких счетов в случае отсутствия движения денежных средств на них при наступлении условий, предусмотренных договором об открытии текущего счета.

Операции по Счетам могут совершаться в подразделениях Банка и (или) в системе «СберБанк Онлайн».

**Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону: 148 – в стационарной и мобильных сетях (+375 25/ 29/ 44) 5-148-148, в том числе для международных звонков**

УНП 100219673

**ОАО «Нафтан»**

РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество

| Пометка на конверте | Наименование | Инв. № | Год ввода в эксплуатацию | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|---|
| Реализация неликвидов, Нафтан, 18.05.2023 | Плотномер DM-230.2 | 08158045 | 2009 | 1696,00 | 2035,20 |
| | Плотномер DM-230.2 | 08158046 | 2009 | 1696,00 | 2035,20 |
| | Цистерна съемная 2 м³ | 06273326 | 2009 | 8733,00 | 10479,60 |
| | Цистерна съемная 2 м³ | 06273327 | 2009 | 8733,00 | 10479,60 |
| | Машина маркировочная ММ-4М | 06270701 | 2007 | 1696,00 | 2035,20 |
| | Агрегат сварочный дизельный АДД-4004 | 06274841 | 2010 | 1475,00 | 1770,00 |
| Реализация неликвидов, Полимир, 18.05.2023 | Резательная машина | 195111 | 2004 | 1476,00 | 1771,20 |
| | Резательная машина | 195112 | 2004 | 1476,00 | 1771,20 |
| | Резательная машина МРБ-100 | 195349 | 2005 | 5952,00 | 7142,40 |
| | Емкость конденсата V=200 м³ | 143206 | 1967 | 40000,00 | 48000,00 |
| | Емкость конденсата V=200 м³ | 143207 | 1967 | 40000,00 | 48000,00 |
| | Экструзионная линия «Арсенал-1600Е» | 196797 | 2009 | 98400,00 | 118080,00 |
| | Установка для производства рукавной пленки | 191769 | 1986 | 11915,00 | 14298,00 |
| | Установка рукавной пленки УРП-1500-3 | 192490 | 1988 | 29600,00 | 35520,00 |
| | Установка УПР-1500-6 для изготовления пленки | 193887 | 1995 | 11250,00 | 13500,00 |

**Состояние удовлетворительное.**

**Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 18 мая 2023 года с пометками на конверте, указанными в таблице, либо в электронной форме на e-mail: tender.box@naftan.by с вышеуказанными пометками.**
**Извещения на проведение конкурсов размещены на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42.**

УНП 300042199

**Извещение о повторно открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 16 мая 2023 года**

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Новодворная, 9 (У-291, микрорайон «Зарица-5») 440100000003004605** | 0,0855 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 12 %. Фундамент: блоки железобетонные; площадь застройки: 136 кв. м | 4 400 |
| Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона: 361,30 руб. Начальная цена предмета аукциона 22 366,68 руб. (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения 5 146,98 руб.; земельного участка: 17 219,70 руб.) | | | | |

Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения в течение 10 рабочих дней; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «ГАГРЗК» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; в установленный срок продолжить строительство жилого дома. Затраты на организацию и проведение аукциона рассчитываются исходя из фактических затрат и доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 16 мая 2023 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 19 апреля по 11 мая 2023 мая года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: +375 (152) 626055, 626056. http://gcn.by, telegram-канал: https://t.me/grodno_cn**

Абмяркуем

# Спорт ці масавая фізічная культура?

## ...як правільна расстаўляць прыярытэты

**Для развіцця школьнага і студэнцкага спорту ў Беларусі створаны выдатныя ўмовы. Новыя ўстановы адукацыі, якія ўводзяцца ў строй у буйных гарадах, як правіла, маюць свае басейны, могуць пахваліцца некалькімі спартыўнымі і трэнажорнымі заламі, вялікім стадыёнам, баскетбольнымі і валейбольнымі пляцоўкамі і нават тэніснымі кортамі.**

**На сёння ў краіне налічваецца 23,3 тысячы фізкультурна-спартыўных збудаванняў, у тым ліку 164 стадыёны, 61 манеж, 408 хакейных каробак, 206 лыжных баз, 1207 футбольных палёў, 1971 баскетбольная пляцоўка, 91 спартыўная траса і гэтак далей. Фізкультурна-спартыўныя аб'екты ўводзяцца таксама ў райцэнтрах і аграгарадках.**

### ЛЯДОВЫЯ АРЭНЫ — НЕ ДЛЯ ЎСІХ?

— Але, як паказвае практыка, нягледзячы на створаныя ўмовы, спартыўныя вынікі не заўсёды адпавядаюць чаканням. Гэта значыць, што нам, як кіраўнікам, трэба рабіць нейкія высновы, магчыма, мы штосьці ўпускаем, — падзяліўся думкамі з удзельнікамі сумеснай калегіі свайго ведамства і Міністэрства адукацыі **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК**. — Безумоўна, падмурак для спорту вялікіх дасягненняў — дзіцячы спорт. Таму больш пільную ўвагу трэба ўдзяляць далучэнню да фізічнай культуры і спорту ўсіх беларускіх школьнікаў. Некалі ўсе хлопцы гулялі ў футбол, гэта можна было назіраць ва ўсіх дварах, а сёння толькі ў Мінску налічваецца 250 футбольных палёў і яны пераважна пустуюць. Чаму так адбываецца?

Мы не падзяляем спартыўныя аб'екты на нашы і вашы. Іх усе можна выкарыстоўваць у інтарэсах сістэмы адукацыі. За апошнія 30 гадоў у краіне з'явілася 45 лядовых арэн, але, як паказаў аналіз іх загрузкі, у першай палове дня многія з іх пустуюць...

**Намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр БАРАУЛЯ** прывёў прыклад:

— У адным з гарадоў Брэсцкай вобласці лядовая арэна, утрыманне якой каштуе дзяржаве вялікіх грошай (гэта і камунальныя плацяжы, і заробак абслуговаму персаналу, і іншае) не выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе ўвогуле, між іншым, у горадзе ёсць 22 агульнаадукацыйныя школы, і толькі 1,5 працэнта ад агульнай колькасці ўсіх навучэнцаў, якія маюць асноўную групу здароўя, праходзяць вучэбна-трэніровачны працэс на лёдзе. Між іншым, лядовыя палацы будаваліся ў тым ліку і для нашых дзяцей, таму нам трэба прадумаць механізм загрузкі спартыўных аб'ектаў у ранішнія і дзённыя часы. Чаму б не замацаваць за лядовымі пляцоўкамі канкрэтныя школы і не навучаць дзяцей катанню на каньках — так, як мы навучаем іх плаванню там, дзе ёсць такая магчымасць? Ці не адкрываць у школах, размешчаных недалёка ад лядовых арэн, спецыялізаваныя спартыўныя класы з арганізацыяй вучэбна-трэніровачага працэсу на лёдзе?

Басейнаў у нашай краіне яшчэ больш, але і там сітуацыя падобная. Зноў-такі прыклад з Брэсцкай вобласці: у горадзе ёсць два басейны і ніводнага спецыялізаванага спартыўнага класа. І толькі чатыры працэнты ад агульнай колькасці навучэнцаў у горадзе наведваюць басейн у рамках адукацыйнага працэсу.

### ВАЖНАЯ ПЕРАМОГА НАД САБОЙ

«Сёння спартыўнымі мерапрыемствамі і спаборніцтвамі (у першую чаргу гэта Рэспубліканская спартакіяда школьнікаў і Рэспубліканская ўніверсіяда студэнтаў) у нас ахоплены 80 працэнтаў хлопцаў і дзяўчат з асноўнай групай здароўя — пачынаючы ад адборачных этапаў і заканчваючы фінальнымі спаборніцтвамі. Гэта даволі высокая лічба — вынік сумеснай работы не толькі двух міністэрстваў, але і федэрацый па спорце, — праінфармаваў удзельнікаў калегіі **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ**. — Важна адзначыць і наша ўзаемадзеянне з Нацыянальным алімпійскім камітэтам, з Прэзідэнцкім спартыўным клубам. У хлопцаў і дзяўчат ёсць магчымасць не проста праявіць сябе — іх можа заўважыць вопытны трэнер, і дзіця атрымае пуцёўку ў спартыўнае жыццё. Але Міністэрства адукацыі бачыць неабходнасць прыцягнення моладзі ў фізічную культуру і спорт не толькі для таго, каб выхаваць спартсменаў вышэйшых дасягненняў. Мы хочам, каб нашы маладыя людзі былі здаровыя, моцныя і гатовыя да доўгага жыцця».

| В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 5680 | 4695 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -1226 | -1084 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | 351 | 127 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 933 | 704 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 3872 | 3034 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 18361 | 15913 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 0 | 0 |

8. Среднесписочная численность работающих (человек): 614.
9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): производство и реализация мебели 99,4 %.
10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2022 год: 23.03.2023 г.
Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности подготовлено 10.03.2023 г.
Аудит проведен: Аудиторская организация: Общество с ограниченной ответственностью «Аудит и Право Плюс».
Местонахождение: 223021, Минская область, Минский район, Щомыслицкий с/с, район агрогородка Озерцо, Менковский тракт, 2, помещение 615.
Сведения о государственной регистрации: свидетельство о государственной регистрации выдано решением Минского горисполкома от 29 апреля 2021 г., зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 193541370.
Период, за который проводился аудит: 01.01.2022-31.12.2022.
Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях:
Мы провели аудит прилагаемой годовой индивидуальной бухгалтерской отчетности ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» (Местонахождение: 246008, Республика Беларусь, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, свидетельство о государственной регистрации выдано Гомельским областным исполнительным комитетом 27 апреля 2000 г., зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 400078768), состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 31.12.2022 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, примечаний к годовой индивидуальной бухгалтерской отчетности, предусмотренных нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления индивидуальной бухгалтерской отчетности предприятиями.
По нашему мнению, прилагаемая годовая индивидуальная бухгалтерская отчетность ОАО "Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО "Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» на 31 декабря 2022 года, финансовые результаты деятельности и изменение ее финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: Единый информационный ресурс рынка ценных бумаг (ЕПФР) 11.04.2023.
13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): применяется Регламент работы с реестром акционеров, Положение об аффилированных лицах, Положение о дирекции, Положение о ревизионной комиссии, Положение о счетной комиссии.
14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет – www.progres.gomel.by.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) в процедуре ликвидации юридического лица, проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **СКЛАД ТЯЖЕЛЫХ МЕТАЛЛОВ с инв. № 640/С-39784 общей площадью 634,6 кв. м, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101Д;**
- **ОЧИСТНЫЕ СООРУЖЕНИЯ ДОЖДЕВЫХ СТОКОВ (инв. № 98331) с инв. № 640/С-84365, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101;**
- **ДРЕНАЖНАЯ НАСОСНАЯ СТАНЦИЯ (инв. № 98329) с инв. № 640/С-84375 общей площадью 330,6 кв.м, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101/7.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624650100001010099** *(право аренды по 18.01.2053)* **площадью 0,2816 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101Д.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: территория, подлежащая специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), пл. 0,2816 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 69 000,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **6 900,00** бел. руб. *Начальная цена снижена на 40 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель). Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 09.02.2023, 22.03.2023.

Аукцион состоится **29.04.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.04.2023** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра 8 (044) 72 35 122.**

УНП 600074992



**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью **«Юнайтед Стил-Ситинг»** (УНП 291479120), объявляет о проведении **28.04.2023 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

# «ПІСЬМЕННІК — РЫБА, ЯКАЯ ПАВІННА ПЛАВАЦЬ У САМЫХ ГЛЫБІНЯХ ЖЫЦЦЯ...»

## Штрыхі да біяграфіі Платона Галавача

***«Рослы, стройны, прыгожы малады чалавек з бялявай чупрынай, якой не стараўся закрываць свой шырокі і высокі лоб, з блакітнымі вачамі, белымі, як цукар, зубамі, з правільнымі рысамі твару, на якім заўсёды ззяла ўсмешка, акуратна апрануты і абуты... Скажу шчыра — не любіць яго была нельга».***

Так успамінаў паэт Павел Пруднікаў пра Платона Галавача, паэта, пісьменніка, публіцыста, які нарадзіўся 125 гадоў таму.

Пражыў ён няшмат — у трыццаць чатыры гады абарвала бязлітасная эпоха нітку лёсу... Але паспеў шмат. І напісаць, і пасады заняць, і адмовіцца ад тых пасад, быць пры ўладзе — і захаваць сціпласць. Як згадваў Янка Скрыган, «ён як бы пачуваў сябе няёмка, што яго запрасілі на такое пачэснае месца, і стараўся быць у цяньку».

### ПЛАТОША

Зразумела, сяброў у Платона Галавача хапала — і сярод іх дзве постаці, якія здаюцца нам супрацьлеглымі: «аглабельны крытык» Лукаш Бэндэ і пясняр Янка Купала.

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваецца шмат матэрыялаў, якія датычацца Платона Галавача, сярод іх — рукапісы паэта Міколы Хведаровіча, у тым ліку артыкул пра Галавача:

*«Нарадзіўся Платон Галавач у 1903 годзе 18 красавіка ў вёсцы Пабогавічы Бабруйскага раёна ў беднай сялянскай сям'і. З малых гадоў ён зазнаў шмат цяжкога жыцця. Не было яму і двух гадоў, калі памерла матуля. Станавіўся на ўласныя ногі без мацярынскай увагі, многа разоў быў горка пакрыўджаны».*

Хведаровіч коратка апісвае творчы шлях Галавача і пераходзіць да ўласных успамінаў:

*«Хто не ведаў яго літаратурнае імя ў канцы дваццатых і пачатку трыццатых гадоў, калі ён працаваў Оргсакратаром ЦК ЛКСМБ, а потым сакратаром ЦК ЛКСМБ. Неаднойчы і мне даводзілася звяртацца да яго. Платон Галавач, як многія яго звалі, «Платоша», знаходзіў для кожнага шчырае слова, сумеў заступіцца за беспадстаўна пакрыўджанага...*

*Маленькі аднапавярховы домік на вуліцы Карла Маркса, на тым месцы, дзе зараз знаходзіцца шматпавярховы будынак праектнага бюро. Ля дзвярэй невялічкая шыльда: ЦК ЛКСМБ. Калі б я ні заходзіў у гэты домік, заўсёды сустракаў сваіх сяброў, маладых беларускіх паэтаў. За сталом сядзеў белакуры юнак у вышытай васількамі кашулі».*

Хведаровіч апісвае, як пры ім Галавач званіў рэктару ўніверсітэта і прасіў прызначыць стыпендыі студэнтам-паэтам.

*« — Цяжка прабіваць бюракратычную сцяну, — казаў ён нам. — Вось ужо цэлы тыдзень абяцаюць пакой студэнтам-пісьменнікам у новым памяшканні інтэрната па Ленінскай вуліцы. А пакуль што хлопцам няма дзе жыць. Пакойчык у Мінску знайсці не лёгка».*

Грамадская праца адымала шмат часу, пра што сведчыць і Хведаровіч.

*«Творчай працай можна было займацца толькі тады, калі ўсе людзі сняць салодкія сны. Ведаю, што па гэтаму пытанню давялося шмат гаварыць на партыйным сходзе і нават справа дайшла да кіраўніцтва ЦК КПБ. Сустракаў я Галавача незадаволенага. Тым больш, не было ў яго вялікай дружбы з кіраўніцтвам БелАПП, бо (далей выкраслена. — **Л. Р.**) там былі розныя па натуры людзі. Александровіч быў чалавекам гарачым і патрабавальным. На кожную з'яву ў літаратурным жыцці ён будаваў шырокія планы. Галавач любіў быць далей ад той літаратурнай сумятні, якая забірала творчы час і адрывала ад пісьмовага стала... Псаваў настрой Галавачу і Лукаш Бэндэ. Праўда, некаторы час паміж імі былі дружалюбныя адносіны, але ж Бэндэ сваімі наскокамі моцна крыўдзіў шчырых і добрых пісьменнікаў, за што Галавач часта браўся з ім у «рожкі».*



Дарэчы, першапачаткова Хведаровіч хацеў назваць свой артыкул «Платоша», але рэдактары папраўілі на сухое «Платон Галавач».

### «ВУЗЕЛ ТРЭБА БЫЛО РАЗАРВАЦЬ ТАК ЦІ ІНАКШ»

*«...вось ужо некалькі месяцаў мяне мучыць становішча раздвоенасці паміж літаратурнай работай і той грамадскай работай, якую я павінен несці як член партыі і якая не дае мне магчымасці для творчага майго росту як пісьменніка... Адчуваючы сілу для таго, каб напісаць больш моцныя творы, чым напісаныя мною, я гэтага зрабіць усё ж не магу, і не магу па той прычыне, што я валадаю надзвычайна малым літаратурным багажом, які акрамя таго з цягам часу змяншаецца, і я не маю магчымасцей падвышаць яго... А мне як пісьменніку трэба многа і многа вучыцца».*

Гэта ўрыўкі з ліста Платона Галавача ў Мінскую гарадскую кантрольную камісію КПБ. У лісце ён просіць... аб сваім выхадзе з партыі. Учынак на той час нечуваны! Тым болей аўтар гэтай заявы — зусім не шараговы партыец, ён першы сакратар ЦК ЛКСМБ, намеснік наркама асветы, сябра ЦК... У Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, БелАПП, у якую рэарганізаваўся «Маладняк», таксама на кіруючай пасадзе.

У БДАМЛМ захоўваецца ліст невядомаму з імем Алесь, напісаны Платонам Галавачом 18 лістапада 1931 года, калі перажывалася самая бура пасля напісання яго заявы аб выхадзе з партыі, і многія сябры і знаёмыя не разумелі ягоны ўчынак. «Па гэтай прычыне я баяўся крыху разарваць канверт твайго ліста, хоць ведаў, што твой ліст не будзе такім, як ліст Андрэя», — піша Галавач, маючы на ўвазе, хутчэй за ўсё, Андрэя Александровіча.

*«Над тым, што я зрабіў, я многа і доўга думаў. З першых жа дзён майго свядомага жыцця, лічу што яно ў людзей пачынаецца не так рана, як думаюць многія з «вучоных», — я імкнуўся быць максімальна вольным у сваёй дзейнасці. Свой далейшы жыццёвы шлях як грамадзяніна, я мыслю як шлях пісьменніка. Гэта зусім не значыць, што я не змагу нічога другога рабіць. Наадварот. Я заўжды змагу заняцца любой фізычнай работай, змог бы быць, як многія др., нядрэнным газетчыкам і г.д. А акрамя ўсяго гэтага, я ніколі не мысліў пісьменніка як нешта вузкае, як нешта габінетнае. Пісьменнік рыба, якая павінна плаваць у самых глыбінях жыцця... Творчасць, калі яна не тандэнтная, гэта мозг і нэрвы. Дык вось іх я хачу цалкам аддаць сваёй творчай рабоце, а яе мыслю як адно цэлае з вучобай, з самым глыбокім пазнаннем жыцця і таго хто яго робіць — чалавека, чалавека, якога я ўсё ж, нягледзячы на ўсе яго недахопы — люблю...*

*У лісце ты пішаш, каб я моцна сябе памацаў і паглядзеў, ці сапраўды мне лягчэй? Адказваю: так. Вузел трэба было разарваць так ці інакш. Інакш я не змог і на мой погляд інакшы спосаб быў немагчымым».*

Як сапраўдны творца, Платон Галавач быў ідэалістам і верыў, што жаданне прысвяціць сябе толькі творчасці зразумеюць. Кажуць, яго крамольную заяву ў рэшце рэшт перадалі самому Сталіну. Галавача выклікалі ў ЦК, учынілі яму сапраўдную экзекуцыю... Урэшце ён мусіў публічна раскаяцца ў сваім «палітычна шкодным для партыі» ўчынку і папрасіць вярнуць заяву.

### БЕЛАПП СУПРАЦЬ «УЗВЫШША»

У лісце да невядомага Алеся Галавач непакоіцца, што некаторыя ворагі ўзрадуюцца ягонаму ўчынку, падумаюць, што ён да іх цяпер далучыцца...




**Мікалай Гусеў. Сяброўскі шарж на Платона Галавача.**

Але прымірэння з імі не плануе. *«Калі можа будучы размагнічаным я часам і страдаў парокамі блізкімі да іхных, дык цяпер я змагу быць з імі больш жорсткім. Пры ўсім маім «чалавекалюбіі», я змагу даволі жорстка біць іх па іхных чарапох».*

Аб якіх жа ворагах, якія чакаюць, што ён да іх далучыцца, а ён іх крытыкуе, піша Платон Галавач?

У фондах БДАМЛМ у пошуках матэрыялаў пра Галавача я натрапіла на нумар газеты «Звязда» ад 30 снежня 1929 года. Вельмі каларытны... На апошняй старонцы, дзе рэкламныя абвесткі, побач з рэкламай «выключна дакументальнага фільма «Салаўкі» — абвестка *«Падпішэцеся на часопісь, прысвечаную выключна літаратуры, мастацтву і крытыцы — «Узвышша».* Чацвёрты год выдання». А разгортваеш газету — і бачыш вялікі артыкул пад красамоўнай назвай *«Пра ваяўнічае мяшчанства ў літаратуры, пра рыцараў пад маскамі, пра адну сямейку і антысавецкія выступленьні некаторых яе сынкоў, а таксама пра разьюшаны нацыянал-дэмакратызм»*, які скіраваны супраць згаданага «Узвышша». Гэта менавіта той артыкул, дзе гучаць знаёмыя ўсім даследчыкам гісторыі беларускай літаратуры радкі: *«Фэт, Бальмант, Ахматава, Бунін — вось крыніцы, адкуль развівае Лужанін свой эстэтычны густ і прыносіць у сучасную паэзію прыкрыя адрыжкі мінулага, якія, як старыя залежалыя ўборы, сьмярдзяць нафталінам».*

У артыкуле рэзка крытыкуюцца сябры літаратурнага аб'яднання «Узвышша» кшталту Лужаніна і Дубоўкі. А супрацьпастаўляецца «няправільнаму» «Узвышшу» БелАПП — Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў. Зазначаецца: *«Разам з тым мы павінны змагацца і за тыя карысныя, моцныя літаратурныя сілы, якія могуць і хочуць служыць сваёй творчасцю справе пралетарыяту, але якія падпалі пад уплыў варожых элементаў. Мы павінны змагацца, каб вызваліць з-пад шкоднага ўплыву гэтай групы такіх блізкіх да нас пісьменнікаў, як напрыклад: З. Бядуля, П. Глебка, Крапіва, К. Чорны, Кляшторны».*

Аўтараў артыкула двое: белапаўцы Алесь Звонак і Платон Галавач. Адразу адчуваецца, што ідэолагам БелАПП быў сябар Платона Галавача Лука Бэндэ, які сцвярджаў: *«Трэба нашым пісьменнікам, асабліва пачынаючым, рашуча адмовіцца ад думкі, што вершы пра «месяц», пра «вясну» і інш. вузка асабістыя перажыванні маюць якую-небудзь вартасць».*

Што ж, палеміка паміж «Узвышшам» і БелАПП тады ішла нежартоўная. У артыкуле адгукаецца нават барацьба наконт таго, да якога аб'яднання быў бліжэй нядаўна памерлы паэт Паўлюк Трус. Члены кожнага аб'яднання даказвалі, што Трус быў менавіта іхні.

Час прымірыў усіх, зрабіўшы колішнія «разборкі» неістотнымі. У 1932 годзе выйшла пастанова ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Замест усіх літаратурных аб'яднанняў узнік адзіны Беларускі саюз савецкіх пісьменнікаў. Галавача ўключылі ў камісію па масавай працы.

Сябрам ЦВК БССР Галавач заставаўся да 1935 года. За гэтыя гады ён паспеў напісаць аповесці «Носьбіты нянавісці» і «Яны не пройдуць!», раман «Праз гады» і нарыс пра будаўніцтва Беламорканала.

А ў жніўні 1937 году ён быў арыштаваны. Пры вобыску канфіскавана 67 сшыткаў рукапісаў. Перад расстрэлам Платон Галавач паспеў пакінуць у камеры запіску: «Таварышы, даруйце, калі чым вінаваты перад вамі. Гісторыя яшчэ скажа праўду пра нас. Платон».

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ПЕРАЕМНАСЦЬ, КАНЦЭПТУАЛЬНАСЦЬ, ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

## «Беларускі гістарычны часопіс» святкуе юбілей

**«Беларускі гістарычны часопіс» адзначае 30-годдзе. За гэты час на яго старонках было надрукавана звыш 3500 артыкулаў, распрацовак урокаў і сцэнарыяў пазакласных мерапрыемстваў. Яго аўтарамі стала больш за 200 чалавек, сярод іх — вядучыя вучоныя, выкладчыкі ВНУ, настаўнікі, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк.**

**«Сёння калектыў часопіса ажыццяўляе дзяржаўныя задачы адукацыі і выхавання праз практычную дапамогу выкладчыкам і настаўнікам гісторыі... Выконвае ролю сапраўднага бібліёграфа гісторыі Беларусі, раскрываючы самыя таямнічыя старонкі мінулага. Тлумачыць складаныя пытанні зараджэння і развіцця дзяржаўнасці на нашых землях. Вяртае з небыцця прозвішчы славутых продкаў, якія ўнеслі значны ўклад у станаўленне нацыі», — адзначыў у прывітальным слове, якое было зачытана падчас юбілейнага мерапрыемства, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар Сергеенка. Урачыстасці прайшлі ў Мастацкай галерэі імя Міхаіла Савіцкага. Тут з нагоды юбілею выдання сабраліся навукоўцы, члены рэдкалегіі, аўтары і прыхільнікі.**

**Падчас святкавання знамянальнай даты галоўны рэдактар «Беларускага гістарычнага часопіса» Аляксандр КОРЗЮК агучыў прынцыпы выдання: пераемнасць, канцэптуальнасць, прафесіяналізм. Менавіта з гэтых трох слоў і пачалася наша з ім гутарка. Я пацікавілася: «Што за імі стаіць?»**



**Галоўны рэдактар «Беларускага гістарычнага часопіса» Аляксандр КОРЗЮК.**

— За трыццаць гадоў было выдадзена некалькі соцень часопісаў, так, юбілейны нумар стаў 284-м. Мы калегіяльна вырашалі, як коратка, ёміста, дакладна назваць усё, што было зроблена за гэты час аўтарамі і членамі рэдкалегіі. Гэтыя словы — і нашы прынцыпы, і наш дэвіз, і нашы мэты. «Беларускі гістарычны часопіс» паводле меркаванняў, якія мы не раз чулі ад нашых чытачоў, заўсёды друкаваў і друкуе праўду. Штомесяц мы павінны выдаваць новы высакаякасны кантэнт на 72 старонках. І кожны нумар — гэта спаборніцтва з самімі сабой, гэта выклік, вынік супольнай працы вялікай колькасці людзей: аўтараў, рэдактараў, карэктараў. У складаных выпадках мы звяртаемся па кансультацыі да спецыялістаў у розных галінах, вывяраем тыя факты, якія друкуюцца ў аўтарскіх матэрыялах. Таму кожны нумар — гэта і невялікая перамога: рэдакцыі, якая выпусціла якасны запатрабаваны часопіс, і аўтараў. Так, сярод іх ёсць вопытныя спецыялісты, якія ведаюць фармат і патрабаванні часопіса, але з'яўляюцца і тыя, хто напісаў нам упершыню. Разам з намі яны працуюць над словам, над стылем, над дакладнасцю, над спасылкамі, і гэта працэс іх унутранага росту.

***— Якія гістарычныя факты былі ўпершыню агучаны ў «Беларускім гістарычным часопісе»?***

— Можна згадаць эпіграфічнае даследаванне Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку, якое праводзіць дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання БДПУ імя Максіма Танка Іна Калечыц. Усе звесткі пра надпісы ў памяшканні дадзенага помніка ад старажытнасці да XIX стагоддзя, якія яна на працягу многіх гадоў збірае і вывучае, спачатку знайшлі адлюстраванне на старонках нашага часопіса, потым ляглі ў аснову манаграфій, вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў. На старонках «Беларускага гістарычнага часопіса» аператыўна даносіцца інфармацыя ад археолагаў. Іх экспедыцыі могуць быць багатыя на цікавыя артэфакты, знаходкі, даваць матэрыял для «састарэння» гарадоў, падзей. Так, упершыню публікацыя пра ўнікальную знаходку — пячатку Ефрасінні Полацкай — была надрукавана ў нашым часопісе. Увогуле, полацкая археалогія дзякуючы рэктару Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова, доктару гістарычных навук, прафесару Дзянісу Дуку, які сам выхадзец з Полацка, прадстаўлена поўна, у юбілейным нумары ён прадставіў свой абагульняючы артыкул на тэму, што зроблена за перыяд існавання «Беларускага гістарычнага часопіса».





**Пра надпісы ў Спаса-Праабражэнскім храме Полацка многія ўпершыню даведаліся з «Беларускага гістарычнага часопіса».**

Вядомая даследчыца ўніяцкага жывапісу Галіна Флікоп-Світа даследавала мноства абразоў, прадметаў культавага жывапісу ўніяцкай царквы. Яе знаходкі, артыкулы, перш чым увайсці ў манаграфіі, каляровыя фотаальбомы, знайшлі сваё адлюстраванне на старонках часопіса. Наогул, такіх прыкладаў шмат, таму што час, калі вынікі даследаванняў будуць афармлены ў выглядзе манаграфіі, можа заняць некалькі гадоў, але аб сваім адкрыцці ці знаходцы вучоны можа паведаміць навуковаму грамадству праз часопіс. Ён, дарэчы, на дадзены момант з'яўляецца адзіным штомесячным выданнем па гістарычных, юрыдычных навуках, мастацтвазнаўству і культуралогіі. І таму мы карыстаемся вялікім попытам, запатрабаванасцю ў нашых аўтараў, што дазваляе нам адбіраць цікавыя і якасныя артыкулы.

***— Падчас урачыстасцяў неаднойчы прагучала думка, што часопіс павінен стаць адным з галоўных выданняў, якім карыстаюцца настаўнікі гісторыі. Ці трэба яго адаптаваць і пад школьнікаў?***

— Вучні могуць выкарыстоўваць матэрыялы разам з настаўнікамі для падрыхтоўкі да алімпіяд і навукова-практычных канферэнцый навучэнцаў. Часопіс запатрабаваны ў студэнтаў, яны шукаюць матэрыялы для курсавых і дыпломных работ. Многія нашы чытачы з цягам часу ператвараюцца ў аўтараў. Мы гатовыя супрацоўнічаць як са сталымі, так і з аўтарамі-пачаткоўцамі, усімі, хто мае што сказаць. Чакаем цікавыя высакаякасныя матэрыялы, якія могуць быць запатрабаваныя шырокім колам чытачоў і карысныя для выкарыстання ў адукацыйным працэсе ва ўстановах сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Вельмі добра, што да нашых аўтараў далучаюцца музейныя супрацоўнікі і бібліятэкары. Гэта тыя катэгорыі чытачоў, падпісчыкаў, якія раней не былі дастаткова актыўнымі, але цяпер мы маем тэндэнцыю да павелічэння колькасці матэрыялаў з іх боку, як і ад кіраўнікоў настаўніцкіх метадычных аб'яднанняў. Апошнія валодаюць досведам выкладання гісторыі ў пэўнай мясцовасці па зрэзе ўстаноў адукацыі і могуць парэкамендаваць вопыт сваіх калег. Многія настаўнікі, асабліва з вясковых школ, кажуць, што ў іх нічога асаблівага няма, маўляў, яны праводзяць звычайныя ўрокі, а насамрэч маюць цікавыя ідэі і метадычныя распрацоўкі.

***— Ці можна сказаць, што БГЧ з'яўляецца адлюстраваннем развіцця гістарычнай думкі?***

— Я не ведаю ніводнага сур'ёзнага навукоўца, гісторыка, археолага, спецыяліста ў розных галінах гістарычнай навукі, які б не друкаваўся на нашых старонках. З упэўненасцю можна сказаць: калі ўзяць увесь стос у 284 нумары вышынёй у паўтара метра, то перад намі будзе прадстаўлена ўся панарама развіцця гістарычнай навукі ў Беларусі за час незалежнасці. Мы хочам абагульніць артыкулы, якія былі надрукаваныя па шэрагу кірункаў, і распачаць сёлета стварэнне серыі пад умоўнай назвай «Бібліятэка «Беларускага гістарычнага часопіса». Гэта будзе шэраг невялікіх навукова-папулярных зборнікаў, у якія ўвойдуць артыкулы па тэматычных блоках, што былі надрукаваны на працягу 30-ці гадоў з улікам іх актуальнасці і ступені запатрабаванасці. Дадзены праект будзе прымеркаваны да Года міру і стваральнай працы.

***— Ці часта выкарыстоўваліся матэрыялы з «Беларускага гістарычнага часопіса» для падрыхтоўкі кніг, падручнікаў?***

— Матэрыялы, якія друкаваліся ў БГЧ, увайшлі ў «Настольную кнігу настаўніка гісторыі». Гэта першае выданне падобнага тыпу ў нашай краіне. Яно вырасла з рубрыкі «Школа маладога настаўніка», якая на працягу прыкладна дзесяці гадоў існавала ў часопісе. Абагульненыя, дапоўненыя парады, згрупаваныя па тэматычных блоках, насычаныя прыкладамі і ілюстрацыямі, зробяць дапаможнік незаменным сябрам і сапраўды настольным выданнем для настаўніка.

Часткова матэрыялы, якія друкаваліся ў «Беларускім гістарычным часопісе» ў рубрыках «Падарожжа па даўняй Беларусі», «Імёны вядомыя і невядомыя», былі выкарыстаны беларускім пісьменнікам, які доўгі час быў членам рэдакцыі БГЧ, Вітаўтам Чаропкам. У выдавецтве «Адукацыя і выхаванне», у склад якога ўваходзіць наш часопіс, выдадзена серыя яго кніг «Вялікія князі Літоўскія». Артыкулы пра Івана Хруцкага, Напалеона Орду, Станіслава Манюшку і іншых вядомых грамадскіх і культурных дзеячаў ляглі ў аснову серыі кніг «Сто выдатных дзеячаў Беларусі».

***— Ці не ваш часопіс стварыў, так бы мовіць, моду на расповед пра выдатных асоб беларускай мінуўшчыны?***

— Калісьці мы пачыналі працаваць разам з іншымі часопісамі — «Беларуская мінуўшчына», «Гісторыя. Праблемы выкладання», «Спадчына». З пачатку 1990-х, на працягу дзесяцігоддзя, быў сапраўдны бум літаратуры і перыядычных выданняў па гісторыі. Усе імкнуліся адкрыць ці пераадкрыць з новых гістарычных пазіцый тыя падзеі, факты, імёны, якія былі невядомыя альбо разглядаліся з пункту гледжання класавага падыходу. Але сёння з тае плыні застаўся фактычна адзін «Беларускі гістарычны часопіс». Вельмі многія падзеі і асобы ўпершыню былі адкрыты чытачам менавіта на старонках БГЧ. Шырокая аўдыторыя з нашых старонак даведалася пра Багдана Онкава — фундатара кнігавыдавецкай дзейнасці Францыска Скарыны. Гэтыя матэрыялы былі падрыхтаваны беларускім пісьменнікам, гісторыкам і археографам Генадзем Кісялёвым і даследчыкам жыцця і творчасці Скарыны Рыгорам Андрэяўцом.

Заўважу, што і ў лічбавую эпоху цікавасць да гісторыі не падае, але сёння яна знаходзіць іншыя спосабы праяўлення: праз інтэрнэт, відэа, сацыяльныя сеткі. Але гісторыкі разумеюць, што гістарычнае даследаванне базіруецца на прынцыпах гістарызму, аб'ектыўнасці, строгага прытрымлівання гістарычнай праўды. Тыя крыніцы, што я пералічыў, па названых пазіцыях не могуць на дадзены момант канкурыраваць з друкаванымі выданнямі. Мы, гісторыкі, павінны фарміраваць аб'ектыўны погляд, а не гнацца за «смажанымі» фактамі і таннымі сенсацыямі, якіх, на жаль, у сеціве, у электронных сродках можна сустрэць шмат.




***— Чаму сёння важна ведаць гісторыю?***

— Гісторыя звязаная абсалютна з усімі бакамі жыцця грамадства. Кожны чалавек — носьбіт гісторыі. Праз публікацыі ў часопісе мы імкнёмся паказаць, што яна не толькі тыя сівыя стагоддзі, пра якія пісалі класікі. Гісторыю робім мы. Кожны дзень, які мінуў, стаў гісторыяй. Вядома, вельмі часта сапраўдную ацэнку гістарычным падзеям, фактам, асобам можна даць праз пэўны прамежак часу. Павінны напрацавацца дакументальныя крыніцы. Гістарычныя даныя ўводзяцца ў навуковы ўжытак па меры іх назапашвання, затым яны верыфікуюцца праз архівы, бібліятэкі, археалагічныя раскопкі, крыніцазнаўчыя пошукі. І потым выпрацоўваецца пэўны навуковы, акадэмічны, педагагічны кансэнсус, і мы атрымліваем тую гісторыю, якая трапляе ў падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і навукова-папулярную літаратуру. Мы імкнёмся друкаваць і тыя матэрыялы, якія паказваюць наш час, гэта і распрацоўкі ўрокаў па сучаснай гісторыі Беларусі, артыкулы па палітычнай сацыяльнай гісторыі XX стагоддзя і нават зусім нядаўняй — другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя. Кожным разам мы пераконваемся, што адкрываецца вельмі шмат новых фактаў і дакументаў. Таму можна з упэўненасцю казаць, што працэс гістарычнага пазнання ніколі не спыняецца.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Штучны інтэлект, разумныя гарады, віртуальныя падарожжы...

### УВАЙСЦІ БЯСПЛАТНА, ПАЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ ВА «ЎРОКАХ ЛІЧБЫ» І ТУРНІРАХ

Падчас дзелавой праграмы мерапрыемства на працягу чатырох дзён пройдуць 35 мерапрыемстваў, дзе будуць прадстаўляць дасягненні лічбавізацыі самых розных галін эканомікі і кірункі далейшага развіцця. Падчас Еўразійскага лічбавага форуму яго ўдзельнікі абмяркуюць лічбавую трансфармацыю на прасторы пяцёркі краін саюза: Беларусі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Арменіі. На секцыях III форуму «Лічбавая эканоміка» міністэрствы раскажуць пра лічбавыя дасягненні ў сваіх сферах. А падчас VI Беларускага інфармацыйна-камунікацыйнага саміту можна азнаёміцца з сучаснымі тэхналагічнымі трэндамі накшталт тэхналогій 5G і штучнага інтэлекту.

Каб удзельнічаць у рабоце секцый, неабходна зарэгістравацца на сайце ТІБА (tibo.by), а тыя, хто падпішацца на тэлеграм-канал tibo, набываюць права на бясплатны ўваход на выставу.

Сёлета там прадстаўлена шмат цікавінак для моладзі, у прыватнасці, адкрыты клас з «Урокамі лічбы». Такіх заняткаў, расклад якіх можна паглядзець на сайце tibo.by/cyfra/, будзе 18 па самых розных напрамках.

Падчас выставы на ютуб-канале tibo будуць даступныя анлайн усе мерапрыемствы дзелавой праграмы. Сюды ж абяцаюць штодня аператыўна выкладваць інтэрв'ю з найбольш цікавымі персонамі і кампаніямі.

Таксама адбудуцца турніры па адукацыйнай робататэхніцы больш як па 20 дысцыплінах, свае турніры ў асобнай зоне ладзіць і Беларуская асацыяцыя камп'ютарнага спорту.

### ПАДЛІЧЫЦЬ ПАДАТКІ І ПРАЙСЦІ ДЫСПАНСЕРЫЗАЦЫЮ

Цэнтральная экспазіцыя выставы — стэнд **Міністэрства сувязі і інфарматызацыі** сумесна з дзяржорганамі, прысвечаны тэматыцы «Гарады будучыні — разумныя гарады». Экспазіцыя візуальна ўзнаўляе гарадское асяроддзе і налічвае прыкладна 40 лакацый.

**Белтэлекам** сёлета выступае генеральным партнёрам ТІБА і прадстаўляе экспазіцыю пад дэвізам «Цяпер не толькі сувязь!». Кампанія прэзентуе перспектыўныя тэхналогіі і інавацыйныя рашэнні для гарадской прасторы: відэакантроль, відэаааналітыка, кібербяспека, сетка электразарадных станцый Evika, разумны прыпынак, праграмы «Мой горад» і «Мой універсітэт». Да праграмы «Мой горад» далучаецца ўсё больш населеных пунктаў і нават назіраецца пэўная канкурэнцыя, хто ўкарэніць яе хутчэй. Мабільная праграма дазваляе знаёміцца з прадпрыемствамі горада, запісвацца анлайн на



атрыманне ў ім паслуг, атрымліваць даведачную інфармацыю і сачыць за навінамі горада.

Усе жадаючыя змогуць пазнаёміцца з электроннымі сэрвісамі, якія даступныя кожнаму беларусу і для атрымання якіх нават не трэба выходзіць з дому. **Нацыянальны цэнтр электронных паслуг** прадэманструе работу адзінага партала электронных паслуг і прэзентуе яго мабільную версію, дзякуючы якой можна трапіць у асабісты электронны кабінет асобы з дапамогай ID-карткі і смартфона з NFC-модулем. Спецыялісты цэнтра паказваюць, як заказаць электронную паслугу, напрыклад, прайсці дыспансерызацыю аднаго дня (запоўніць электронную анкету, каб атрымаць рэкамендацыі на абследаванне).

**Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва** прэзентуе сэрвіс, які дазваляе чалавеку сачыць за сваёй працоўнай дзейнасцю, — у новай праграме ёсць уся інфармацыя з папяровай працоўнай кніжкі з 1 студзеня бягучага года. З яе можна даведацца, якія ўзносы плаціць за чалавека работадавец, на якія сацыяльныя выплаты можа разлічваць работнік у пэўнай жыццёвай сітуацыі. А **Міністэрства па падатках і зборах** пазнаёміць з праграмай, што дазваляе асобе, у якой няма наймальніка і якая атрымлівае заробак, напрыклад, ад здачы жылля ў арэнду або грамадзянска-прававых дагавораў, падлічыць падатак на прафесійны даход. Поўны ўлік свайго прыбытку цяпер можна весці не на паперы, а ў праграме.

### «ПРЫМЕРАЦЬ» ЛІЧБАВАГА ДВАЙНІКА І «ПАКАШТАВАЦЬ» ТЭХНАПРАДУКЦЫЮ

На форуме таксама прадстаўлены лічбавыя двайнікі для розных галін эканомікі. Напрыклад, у сферы сельскай гаспадаркі яны цікавыя тым, што дазваляюць траціць менш рэсурсаў і атрымліваць больш вынікаў ад дзейнасці. У будаўніцтве з дапамогай лічбавых двайнікоў можна рабіць нагляд за праектам, сачыць за тым, як ён развіваецца, якія рэсурсы ўжываюць будаўнікі, практычна ў штодзённым рэжыме.

«Лабараторыю лічбавага руху», якую паказвае **Мінспорту**, можа апрабаваць на сабе. Наведвальнік надзявае датчыкі, а камеры, расстаўленыя па перыметры, параўноўваюць рухі чалавека з эталоннымі. Такім чынам можна даведацца, наколькі чалавек развіты для пэўных практыкаванняў у спорце. Прафесійныя спартсмены, дарэчы, выкарыстоўваюць такія гаджэты, каб карэкціраваць свае трэніроўкі.

Свае стэнды на выставе прадстаўляюць Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства прамысловасці, Мінадукацыі, Мінбудархітэктуры, Міністэрства культуры, Дзяржкаммаёмасць, Дзяржкарпарацыя «Расатам» і іншыя.

Эксперты **Дзяржкарпарацыі «Расатам»** расказваюць жадаючым пра лічбавую трансфармацыю ва ўмовах турбулентнасці і трэнды IT-рынку. Расійскія спецыялісты дэманструюць і сваю прадукцыю: комплексную сістэму кіравання праектаваннем на базе платформы інфармацыйнай сістэмы Planner, інструмент матэматычнага мадэлявання ЛОГАС, тэхналагічную вытворчую платформу AtomMind, інтэграваную тэхналогію кіравання жыццёвым цыклам складаных інжынерных аб'ектаў Multi-D і шмат іншага. Кампанія не першы год працуе з Беларуссю, таму ў межах форуму чакаецца падпісанне некалькіх беларуска-расійскіх пагадненняў у сферы рэалізацыі сумесных праектаў.

### «ПРАГУЛЯЦЦА» ПА ЛУКОМЛЬСКАЙ ДРЭС

Арганізацыі **Мінэнерга** прадстаўляюць на выставе больш за 40 інавацыйных праектаў у IT-сферы, у тым ліку інавацыі ў сферы штучнага інтэлекту і рабатызацыі, тэхналогій віртуальнай і дапоўненай рэальнасці, аўтаматызаваныя сістэмы кіравання электрычнымі, цеплавымі і газавымі сеткамі.

Спецыялісты ведамства прэзентуюць праекты па ўкараненні на аб'ектах электрасеткавага комплексу краіны тэхналогій smart grid (разумныя электрасеткі), магчымасці лічбавых падстанцый і лічбавыя платформы для збору, апрацоўкі і захоўвання даных.

**Мінскэнерга,** напрыклад, паказвае аўтаматызаваную сістэму дыспетчарскага кіравання прадпрыемства «Мінскія цеплавыя сеткі», а **Магілёўэнерга** знаёміць з электроннымі мадэлямі сістэм цеплазабеспячэння.

«Офіс лічбавізацыі» дэманструе аб'яднанне **«Белпалівагаз».** Наведвальнікі выставы ўбачаць, як з дапамогай штучнага інтэлекту абследуюцца газаправоды і ліквідуюцца аварыйныя сітуацыі.

А **Віцебскэнерга** выдае наведвальнікам VR-акуляры і адпраўляе ў віртуальнае падарожжа па Лукомльскай ДРЭС ці на палігон для навучання энергазабяспечальных арганізацый. Пры жаданні можна асвоіць асобныя тэхналагічныя працэсы па абслугоўванні энергаабсталявання ў складзе віртуальных брыгад.

Удзельнікі ТІБА абяцаюць усе чатыры дні ўражваць наведвальнікаў выставы на «Мінск-арэне» насычанай праграмай і мерапрыемствамі.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Сканворд




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Ельнік. Чуб. Знак. Ржа. Уладар. Цэля. Кляка. Жар. Азы. Брава. Бал. Рота. Арала. Раз. Раб. Малы. Атава. Сын. Бак.

**Па вертыкалі:** Абзац. Есаул. Норд. Кедр. Чары. Клякса. Арка. Ажына. Арэна. Блазан. Волава. Кораб. Барыс. Араб. Абак.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

Надвор'е

## Вясна не спяшаецца

### Але бярэ сваё

**У красавіку невялікія і цёплыя дажджы ў радасць, ды і тэмпература пайшла ўверх, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Другі тыдзень красавіка ў нашай краіне праходзіў з відавочным паніжэннем тэмпературнага фону, гэта калі дзённыя максімумы ў мінулыя выхадныя ў асноўным не перавышалі плюс 7—13 градусаў, і толькі ў нядзелю па крайнім паўднёвым захадзе краіны паветра днём прагрэлася да плюс 15 градусаў. Аднак пасля халодных і пахмурных выхадных на гэтым тыдні ў краіну зноў вернецца цяпло. Сіноптыкі абяцаюць, што начныя мінімумы будуць знаходзіцца ў межах ад плюс 1 градуса да 9 цяпла, а 22 і 23 красавіка месцамі і да плюс 10 градусаў. Днём вясновае сонца здолее прагрэць паветра да плюс 13—19 градусаў.

У аўторак месцамі па нашым рэгіёне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад плюс 1 градуса па поўначы да плюс 9 градусаў па паўднёвым захадзе, а днём — ад плюс 13 да плюс 19 градусаў. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы і ў сераду. Ноччу і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3—8 градусаў, а ўдзень — плюс 11—18 градусаў.

Аднак ужо ў чацвер, па прагнозах сіноптыкаў, ачаг высокага ціску пачне ўзмацняць свае пазіцыі і абумовіць да канца тыдня пераважна без ападкаў надвор'е. Толькі ў начныя гадзіны ў няўстойлівым паветры месцамі па поўдні краіны яшчэ захаваецца верагоднасць невялікіх кароткачасовых дажджоў. Таму 20 красавіка будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў асобных раёнах на поўдні краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. У начныя гадзіны чакаецца плюс 3—9 градусаў, а ўдзень — плюс 13—19 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных сіноптыкаў, у пятніцу пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, а ўдзень — ад плюс 13 да плюс 18 градусаў.

Без ападкаў чакаецца і ў суботу. У гэтыя суткі ноччу і раніцай у асобных раёнах будзе слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 2—8 градусаў, а месцамі — да плюс 10 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 13—18 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 18 КРАСАВІКА

У краіне

**1793** год — расійскаму Сенату афіцыйна паведамілі аб утварэнні ў Беларусі Мінскай губерні.

**1838** год — нарадзіўся Уладзіслаў Іванавіч Дыбоўскі, беларускі заолаг, батанік палеантолаг, мінералог, фальклярыст, доктар мінералогіі. З 1871-га працаваў на кафедры мінералогіі Дэрпцкага ўніверсітэта, з 1878-га жыў у маёнтку Нянькава на Навагрудчыне. Асноўныя працы па флоры і фаўне возера Байкал. Даследаваў флору і фаўну Навагрудчыны, збіраў беларускі фальклор.

**1903** год — нарадзіўся Платон Раманавіч Галавач, беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Быў адным з кіраўнікоў літаратурных арганізацый «Маладняк» і БелАПП (Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў), рэдактарам газеты «Чырвоная змена», часопісаў «Маладняк» і «Полымя». Аўтар рамана «Праз гады», зборнікаў апавяданняў «Дробязі жыцця», «Хочацца жыць», аповесці «Спалох на загонах», а таксама публіцыстычных і літаратурна-крытычных артыкулаў. У 1937-м быў арыштаваны і прыгавораны да расстрэлу. У 1956-м рэабілітаваны.

**1938** год — нарадзіўся Аляксандр Пятровіч Гусеў, беларускі вучоны, доктар тэхнічных навук. Аўтар навуковых прац па фізіцы магнітных з'яў. Распрацаваў тэорыю магнітнага ўзаемадзеяння групавых уключэнняў і дэфектаў у матэрыялах.

**1943** год — нарадзілася Любоў Рыгораўна Румянцава, актрыса, заслужаная артыстка Беларусі. Працавала на кінастудыі «Беларусьфільм», з 1981-га — у Тэатры-студыі кінаакцёра. Выканаўца лірыка-драматычных і драматычных роляў. Знялася ў фільмах «Альпійская балада», «Міравы хлопец», «Зала чакання» і іншых.

**1948** год — нарадзіўся Анатоль Васілевіч Шаркоў, беларускі гісторык, юрыст, доктар гістарычных навук, прафесар. Даследаваў гісторыю органаў унутраных спраў, адзін з распрацоўшчыкаў Крымінальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь і аўтараў Каментарыя да яго.

У свеце

**1903** год — нарадзіўся Георгій Сяргеевіч Мілюцін, расійскі кампазітар, народны артыст СССР. Аўтар аперэт «Дзявочы перапалах», «Трэмбіта», «Пацалунак Чаніты», песень «Чайка», «Бэз-чаромха», «Ленінскія горы» і іншага.

**1918** год — нарадзілася Аляксандра Васілеўна Пракошына, расійская спявачка, салістка Рускага народнага хору імя Міхаіла Пятніцкага, народная артыстка СССР. Лаўрэат Сталінскай прэміі I ступені.



**1928** год — нарадзіўся Віталь Канстанцінавіч Венгер, расійскі акцёр, педагог, народны артыст РСФСР.

Так гаварыў...

**ПЯТРУСЬ МАКАЛЬ:**

*«Дбаючы разам з векам*
*Аб электронным цудзе,*
*Памятай: чалавекам*
*Ніхто за цябе не будзе».*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.03 | 20.16 | 14.13 |
| Віцебск | 5.50 | 20.09 | 14.19 |
| Магілёў | 5.53 | 20.06 | 14.13 |
| Гомель | 5.53 | 19.59 | 14.06 |
| Гродна | 6.18 | 20.31 | 14.13 |
| Брэст | 6.23 | 20.28 | 14.05 |

### Месяц

*Апошняя квадра 13 красавіка. Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр.* *Фядоры, Марка, Мікалая, Палікарпа, Платона, Сямёна.*
*К.* *Аліцыі, Апалонія, Багуслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

**— Чаму вы хочаце развесціся з мужам?**
**— У нас розныя рэлігійныя погляды.**
**— А больш канкрэтна?**
**— Ён не прызнае мяне багіняй!**

Мужчыны як леглі спаць прыгожымі, так прыгожымі і прачынаюцца...
А жанчыны неяк псуюцца за ноч.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 11.432. Індэкс 63850. Зак. № 867.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 красавіка 2023 года.